**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

# ПРАГРАМА ПРОФІЛЬНЫХ УСТУПНЫХ ІСПЫТАЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

для асоб, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю,
для атрымання вышэйшай адукацыі I ступені
па спецыяльнасцях

6-05-0232-01 “Беларуская філалогія”
6-05-0232-03 “Славянская філалогія”

**2023**

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

## МЕСЦА І РОЛЯ ПРАФЕСІІ ФІЛОЛАГА Ў СУЧАСНЫМ ГРАМАДСТВЕ

За гады вучобы ва ўніверсітэце студэнты-філолагі атрымліваюць грунтоўныя веды па беларускай мове і літаратуры, вывучаюць працэсы гістарычнага развіцця моў і літаратур, даследуюць іх сучасны стан. Па заканчэнні навучання студэнтам, у адпаведнасці з абранай спецыяльнасцю, прысвойваюцца наступныя кваліфікацыі: “Філолаг. Выкладчык”, “Філолаг-перакладчык. Выкладчык”. Спецыялісты з філалагічнай адукацыяй у сучасным сацыякультурным грамадстве маюць вялікую запатрабаванасць: выпускнікі працуюць на розных пасадах не толькі ва ўстановах сярэдняй і вышэйшай адукацыі, але і ў выдавецтвах, рэдакцыях часопісаў і газет, у літаратурных музеях і архівах, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, на радыё і тэлебачанні і інш.

## МЭТА І ЗАДАЧЫ ЎСТУПНЫХ ІСПЫТАЎ

Праграма профільных уступных іспытаў па вучэбным прадмеце “Беларуская літаратура” складзена для асоб, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю і паступаюць у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт у 2023 годзе для атрымання вышэйшай адукацыі І ступені на спецыяльнасці 6-05-0232-01 “Беларуская філалогія”, 6-05-0232-03 “Славянская філалогія”. Профільныя ўступныя іспыты праводзяцца ў вуснай форме.

Дадзеная праграма складзена на аснове “Праграмы ўступных іспытаў па вучэбным прадмеце “Беларуская літаратура” для асоб, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю, для атрымання вышэйшай адукацыі І ступені альбо сярэдняй спецыяльнай адукацыі, 2023 год” (ttps://adu.by/ru/ucheniky/podgotovka-k-ekzamenam.html). Загад Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 31/10/2022 № 644.

Праграма структуравана ў адпаведнасці з асноўнымі змястоўнымі лініямі літаратурнай адукацыі. Праграма ўключае пералік твораў вуснай народнай творчасці і мастацкай літаратуры, звесткі пра асноўныя перыяды беларускага і сусветнага мастацкага працэсу, звесткі аб жыцці і творчасці вядомых майстроў слова, асноўныя тэарэтыка-літаратурныя паняцці. Літаратурныя творы адабраны з улікам іх мастацкай і агульначалавечай значнасці, выхаваўчай каштоўнасці, месца ў творчасці пісьменніка і ў гісторыі літаратуры, актуальнасці для нашага часу. Пры гэтым улічваліся гуманістычны сэнс твораў, дыялектычная сувязь сацыяльнага, канкрэтна-гістарычнага і агульначалавечага ў іх, мастацкая своеасаблівасць, аўтарская пазіцыя.

**Мэтай уступнага іспыту з’яўляецца** праверка ведаў па беларускай літаратуры ў аб’ёме, вызначаным адукацыйным стандартам па вучэбным прадмеце “Беларуская літаратура”, а таксама ацэнка падрыхтаванасці абітурыента да вучэбнай і навукова-даследчай дзейнасці на філалагічным факультэце БДУ.

**Задачы**, якія стаяць перад абітурыентам:

- выявіць веданне вучэбнага прадмета “Беларуская літаратура” у аб’ёме, вызначаным праграмай уступнага іспыту;
- выявіць узровень сфарміраванасці ўменняў і навыкаў аналізу літаратурных твораў, разумення літаратурнага працэсу і творчасці асобных пісьменнікаў;
- выявіць веданне тэорыі і гісторыі літаратурнага парацэсу XI – XXI стст., тэарэтыка-літаратурных паняццяў (літаратурны працэс, род літаратуры, мастацкія напрамкі, метады, жанры, стылі).

## ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ АБІТУРЫЕНТАЎ

**На ўступных іспытах абітурыент павінен ведаць:**

– спецыфіку літаратуры як мастацтва слова, літаратурныя роды і жанры;

– асноўныя перыяды развіцця беларускай літаратуры (ад старажытных часоў да сучаснасці);

– асноўныя эпохі і напрамкі, плыні, роды і жанры літаратуры;

– асаблівасці рамантычнага, рэалістычнага і мадэрнісцкага тыпаў мастацкай творчасці;

– звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, творчасць якіх вывучаецца манаграфічна;

– ідэйна-маральныя праблемы, жанравыя і стылёвыя асаблівасці праграмных мастацкіх твораў, змест, праблематыку, сістэму вобразаў, сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці твораў, якія ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі вывучаліся тэкстуальна, іх канкрэтна-гістарычнае, нацыянальнае і агульначалавечае значэнне;

– неабходны мінімум звестак па тэорыі літаратуры, патрэбных для аналізу і ацэнкі мастацкіх твораў (сюжэт, кампазіцыя; тэматыка, праблематыка, пафас твора); адметнасці паэзіі і прозы як асноўных відаў (тыпаў) літаратурнай творчасці; сродкі мастацкай выразнасці; базавыя паняцці вершаскладання (рытм, рыфма, страфа, вершаваны памер).

**Абітурыент павінен умець:**

- узнаўляць фрагменты мастацкіх карцін, створаных пісьменнікам;
- аналізаваць твор з улікам яго ідэйна-мастацкай цэласнасці і аўтарскай пазіцыі, абапіраючыся на дадзеныя па гісторыі і тэорыі літаратуры;
- вызначаць праблематыку твора;
- выяўляць адметнасці стылю (творчай індывідуальнасці) пісьменніка;
- характарызаваць героя твора, супастаўляць герояў аднаго або некалькіх твораў;
- абгрунтоўваць сваю ацэнку прачытанага твора;
- весці дыялог па прачытаных творах, улічваць чужы пункт гледжання на твор і аргументавана адстойваць сваё меркаванне;
- суадносіць мастацкую літаратуру з грамадскім і культурным жыццём, раскрываць канкрэтна-гістарычны і агульначалавечы змест вывучаных літаратурных твораў.

Адказ павінен быць прадуманым, звязным, паслядоўным. Маўленне абітурыента на ўступных іспытах па беларускай літаратуры павінна вызначацца дакладнасцю, правільнасцю, выразнасцю, лексічным багаццем. Улічваючы спецыфіку беларускай літаратуры як вучэбнага прадмета, выказванне можа мець рысы мэтазгоднай эмацыянальнасці, вобразнасці, а таксама творчыя элементы.

Уступныя іспыты па беларускай літаратуры праводзяцца ў вуснай форме па білетах.

Экзаменацыйны білет уключае два пытанні, скіраваных на праверку ведання праграмных твораў, а таксама звестак па біяграфіі пісьменніка і гісторыі літаратуры.

Пытанні па канкрэтных творах тычацца характарыстыкі тэксту ў цэлым альбо звязаны з асобнымі аспектамі яго аналізу.

Пытанні, прысвечаныя “агульным” тэмам і праблемам беларускай літаратуры, патрабуюць разгляду творчасці некалькіх аўтараў.

У адпаведнасці са зместам праграмы для раскрыцця некаторых экзаменацыйных пытанняў дапускаецца выбар твора абітурыентамі.

Калі ў білеце змешчана пытанне па лірыцы, абавязковым з’яўляецца чытанне верша альбо яго ўрыўка на памяць у якасці ілюстрацыі да адказу.

Білет складаецца з улікам храналагічнага прынцыпу. Для падрыхтоўкі адказу па экзаменацыйным білеце абітурыенту даецца 30 хвілін.

Абітурыент павінен весці запісы ў лісце вуснага адказу (план, тэзісы, ход разважанняў).

У працэсе здачы экзамену абітурыенту могуць быць зададзены дадатковыя пытанні як па змесце білета, так і па любой частцы праграмы ўступных іспытаў.

Адзнака аб'яўляецца адразу пасля завяршэння апытання абітурыента.

Экзаменатары каментуюць правільнасць і паўнату адказаў на пытанні.

Крытэрыі і шкала ацэнкі ведаў абітурыентаў змешчаны ў дадатку.

## ПРЫКЛАДЫ ЭКЗАМЕНАЦЫЙНЫХ ПЫТАННЯЎ

### Варыянт №1

1. Асветніцкая дзейнасць Францыска Скарыны.
2. Маральна-этычныя і філасофскія праблемы ў вершах Максіма Танка.

### Варыянт №2

1. Сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці паэмы "Песня пра зубра" Міколы Гусоўскага.
2. Тэматыка і праблематыка рамана "Людзі на балоце" Івана Мележа.

### Варыянт №3

1. Ідэйна-эстэтычная накіраванасць паэмы "Тарас на Парнасе".
2. Наватарскія пошукі сучаснай беларускай драматургіі (на прыкладзе твораў двух-трох аўтараў).

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Фальклор і літаратура

Спецыфіка фальклору як мастацтва слова. Фальклорныя жанры (казкі, легенды, паданні, песні і інш.). Беларуская народная творчасць як крыніца станаўлення і ўзбагачэння літаратуры.

### Літаратура эпохі Сярэднявечча

Літаратура эпохі Сярэднявечча. Характарыстыка літаратуры Сярэднявечча (XI–XV стст.).

**Кірыл Тураўскі.** Словы. Казанні. Павучанні. Жыццё і літаратурна-асветніцкая дзейнасць Кірыла Тураўскага. Пропаведзь маральнага ўдасканалення чалавека і грамадства, крытыка чалавечых заганаў. Высокае паэтычнае майстэрства асветніка (метафарычнасць, красамоўства, багацце лексікі).

**«Жыціе Ефрасінні Полацкай».** Адлюстраванне ў творы жыцця і дзейнасці асветніцы. Духоўны подзвіг Ефрасінні Полацкай. Рэальныя і гістарычныя факты ў творы. Адметнасць кампазіцыі «Жыція...».

**Беларускі летапіс** («Летапісец вялікіх князёў літоўскіх», «Беларуска-літоўскі летапіс (1446)» – урывак «Пахвала вялікаму князю Вітаўту»). Беларускія летапісы як вытокі мастацкай прозы. Адлюстраванне гістарычнага мінулага ў летапісных творах, іх патрыятычны пафас. Услаўленне мужнасці, аўтарытэту князя Вітаўта, яго подзвігаў.

### Літаратура эпохі Адраджэння

Літаратура эпохі Адраджэння. Агульная характарыстыка літаратуры эпохі Адраджэння (XVI ст.). Пашырэнне гуманістычнага светаўспрымання і светаадчування. Чалавек як мера каштоўнаснага і прыгожага ў мастацтве. Эпоха Адраджэння ў Беларусі.

**Францыск Скарына**. Прадмова да ўсёй Бібліі, прадмова да кнігі Псалтыр. Францыск Скарына – першадрукар і асветнік. Пераклад і выданне кніг Бібліі. Імкненне Францыска Скарыны наблізіць кнігу да народа (старабеларуская мова, прадмовы, тлумачэнні). Вершатворчасць Францыска Скарыны. Рысы рэнесанснага гуманізму ў яго творчасці. Значэнне дзейнасці Францыска Скарыны. Развіццё беларускага кнігадрукавання (Сымон Будны, Васіль Цяпінскі і інш.).

**Мікола Гусоўскі.** Паэма «Песня пра зубра». Мікола Гусоўскі – паэт-гуманіст. «Песня пра зубра» як выдатны твор старажытнай беларускай літаратуры. Жанр, сюжэт і кампазіцыя паэмы. Тэма Радзімы ў творы. Сімвалічнае значэнне вобраза зубра. Вобраз князя Вітаўта, высокая аўтарская ацэнка дзейнасці князя.

### Літаратура эпохі барока

Агульная характарыстыка літаратуры барока (XVII–XVIII стст.). Асаблівасці барока, яго праявы ў літаратуры і іншых відах мастацтва. Палітычная сатыра («Прамова Мялешкі») і гісторыка-мемуарная проза. Вершатворчасць на беларускай мове (Сімяон Полацкі). Станаўленне беларускага тэатра (батлейка, школьная драма і інтэрмедыя).

## Літаратура эпохі Асветніцтва

Агульная характарыстыка літаратуры Асветніцтва (другая палова XVIII – пачатак XIX ст.). Рысы Асветніцтва ў беларускай літаратуры. Развіццё паэзіі і драматургіі.

## Развіццё новай беларускай літаратуры XIX ст.

**Агульная характарыстыка беларускай літаратуры XIX ст.** Фактары станаўлення новай беларускай літаратуры (цікавасць да фальклору, народнага побыту, гістарычнага мінулага і традыцый). Пераважна ананімны характар бытавання твораў. Дзейнасць студэнцкіх таварystваў Віленскага ўніверсітэта. Узнікненне камічных, бурлескных твораў (паэмы «Энеіда навыварат», «Тарас на Парнасе»).

**Ян Чачот.** Вершы «Покуль сонца ўзыдзе...», «Да мілых мужычкоў», «На прыезд Адама Міцкевіча». Беларускамоўная творчасць. Маральна-этычная і сацыяльная праблематыка твораў Я. Чачота.

**Ян Баршчэўскі.** Апавяданні «Шляхціц Завальня», «Плачка», «Белая Сарока» (са зборніка «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях»). Выяўленне светапогляду беларусаў у зборніку апавяданняў «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» (на прыкладзе выбраных твораў). Хараство духоўнага свету чалавека, які трымаецца векавых традыцый, народных звычаяў. Роля вобраза Завальні ў творы. Рамантычныя сюжэты і вобразнасць. Сімволіка вобразаў.

**Адам Міцкевіч.** Балада «Свіцязянка». Паэтычнае асэнсаванне беларускага фальклору і міфалогіі ў баладзе «Свіцязянка». Рамантычнае вырашэнне тэмы кахання ў творы.

**Канстанцін Вераніцын.** Паэма «Тарас на Парнасе». Аўтарства і час напісання паэмы. Сатырычны і гумарыстычны пафас твора. Сцвярджэнне ідэй народнасці ў літаратуры. Роля міфалагічных персанажаў у раскрыцці тэмы і ідэі твора. Тарас як тыповы народны герой, рысы яго характару: кемлівасць, абачлівасць, дасціпнасць.

**Францішак Багушэвіч.** Прадмова да зборніка «Дудка беларуская»; вершы «Мая дудка», «Хмаркі»; паэма «Кепска будзе!». Звесткі пра жыццё і творчасць Францішака Багушэвіча. Ідэйны змест прадмовы да зборніка «Дудка беларуская». Пошукі асноў духоўнага адраджэння народа.

Аўтарскі погляд на ролю паэта і паэзіі ў вершы «Мая дудка». Паэтычнае асэнсаванне ўласнага лёсу ў алегарычным вершы «Хмаркі». Выкрыццё сацыяльнай несправядлівасці ў паэме «Кепска будзе!». Паказ жыццястойкасці беларускага народа. Роля айчыма ў лёсе Аліндаркі. Матыў трагічнасці і безвыходнасці.

**Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч.** Фарс-вадэвіль «Пінская шляхта». Звесткі пра жыццё і творчасць Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Жанравае вызначэнне, сатырычны і гумарыстычны пафас «Пінскай шляхты». Выкрыццё царскага чыноўніцтва. Вобраз Кручкова, яго тыповасць. Вобразы засцянковай шляхты. Праблема бацькоў і дзяцей. Майстэрства драматурга ў разгортванні інтрыгі, сюжэта, у стварэнні камічнага эфекту. Гратэск і шарж як прыёмы фарса-вадэвіля.

**Шляхі развіцця беларускай літаратуры першай паловы ХХ ст.**

**Беларуская літаратура пачатку ХХ ст.** Агульная характарыстыка беларускай літаратуры пачатку ХХ ст. Роля газет «Наша доля», «Наша ніва» ў гісторыі айчыннай культуры і мастацтва слова. Фарміраванне класічных асноў беларускай літаратуры. Праявы мадэрнізму ў беларускай літаратуры. Прыход у літаратуру Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Цёткі, Алеся Гаруна, Максіма Гарэцкага, Вацлава Ластоўскага, Каруся Каганца, Ядвігіна Ш. і інш. Станаўленне беларускага прафесійнага тэатра.

**Цётка.** Вершы «Мае думкі», «Вера беларуса», «Мора». Патрыятычны змест лірыкі Цёткі, паэтызацыя непаўторнасці і хараства Бацькаўшчыны. Матывы і пафас вершаў, іх рамантычна-сімвалічная вобразнасць. Унікальнасць паэтычнага стылю: рытміка, інтанацыя, гукапіс, тропы, паэтычны сінтаксіс.

**Ядвігін Ш.** Апавяданне «Дуб-дзядуля». Увага да праблем чалавечага быцця, сэнсу і каштоўнасці чалавечага існавання. Філасофскі сэнс твора . Лірызм апавядання. Прытчавая аснова. Адметнасць творчай манеры Ядвігіна Ш.

**Янка Купала.** Вершы «Спадчына», «А хто там ідзе?», «Мая малітва» («Я буду маліцца і сэрцам, і думамі...»), «Жняя», «Явар і каліна», «Роднае слова» («Магутнае слова, ты, роднае слова!..»); паэма «Бандароўна»; драма «Раскіданае гняздо». Звесткі пра жыццё і творчасць Янкі Купалы. Асэнсаванне гістарычнага лёсу беларускага народа. Агульначалавечыя матывы ў вершах. Ідэя вечнасці жыцця, кахання, гармоніі паміж чалавекам і прыродай. Жанравае, вобразнае, інтанацыйнае багацце лірыкі.

«Бандароўна». Фальклорная першакрыніца паэмы. Рамантычная аснова развіцця сюжэта. Сутнасць канфлікту. Вобразы-антыподы. Драматызм дзеяння. Маральнае хараство Бандароўны.

«Раскіданае гняздо». Сацыяльна-філасофскі змест п’есы. Сюжэтныя лініі. Жанравыя асаблівасці, кампазіцыя, развіццё канфлікту. Галоўныя героі, матывы іх паводзін. Пошукі маладым пакаленнем рэальных шляхоў вызвалення Бацькаўшчыны. Праўда Сымона і праўда Зоські. Вобраз Старца як выразніка народнай маралі. Вобраз Незнаёмага ў сістэме дзеючых асоб п’есы. Ідэйны сэнс Вялікага сходу. Сімвалічнасць назвы твора. Сцэнічнае ўвасабленне п’есы. Значэнне творчасці Янкі Купалы ў беларускай літаратуры.

**Якуб Колас.** Вершы «Не бядуй!», «Родныя вобразы», «Першы гром»; паэма «Новая зямля»; трылогія «На ростанях» (частка першая «У палескай глушы»). Звесткі пра жыццё і творчасць Якуба Коласа. Элегічнае і аптымістычнае ў паэзіі Якуба Коласа («Не бядуй!»). Паэтызацыя роднай прыроды («Родныя вобразы», «Першы гром»). Рытміка-інтанацыйны лад вершаў Якуба Коласа.

«Новая зямля» – мастацкая энцыклапедыя народнага жыцця. Аўтабіяграфічнасць паэмы, яе творчая гісторыя. Жанравыя асаблівасці твора. Народны побыт і прырода ў паэме. Вобразы Антося, Ганны, дзяцей у паэме. Трагедыя лёсу Міхала. Філасофская ідэя зямлі і волі. Сімвалічны сэнс назвы твора. Паэтычнае майстэрства Якуба Коласа.

Трылогія «На ростанях». Гісторыя напісання і праблематыка, аўтабіяграфізм твора, яго сюжэтныя і кампазіцыйныя асаблівасці.

Жанравыя адметнасці аповесці «У палескай глушы». Прататыпы галоўных герояў. Вобраз Андрэя Лабановіча – беларускага інтэлігента, шукальніка ісціны, сэнсу жыцця. Народ і інтэлігенцыя ў творы. Жаночыя вобразы. Майстэрства Коласа-празаіка: псіхалагізм, багацце мовы, мастацкая дэталізацыя. «Палескі каларыт» твора. Значэнне творчасці Якуба Коласа для беларускай літаратуры.

**Максім Багдановіч**. Вершы «Раманс» («Зорка Венера»), «Слуцкія ткачыхі», «Санет» («Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...»), «Маладыя гады», «Жывеш не вечна, чалавек...», «Плакала лета, зямлю пакідаючы...», «Песняру», «Кніга», «Летапісец», «Мяжы», «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...». Звесткі пра жыццё і творчасць Максіма Багдановіча. Нацыянальныя і агульначалавечыя матывы ў паэзіі Максіма Багдановіча. Багацце духоўнага свету лірычнага героя. Пошукі гармоніі, услаўленне красы жыцця і мастацтва. Погляды Максіма Багдановіча на прызначэнне паэта ў грамадстве. Зварот да культурна-гістарычнай спадчыны Беларусі. Філасофскі пачатак у лірыцы. Скіраванасць да агульначалавечых гуманістычных каштоўнасцей. Рытмічная разнастайнасць і меладычнасць верша.

**Алесь Гарун.** Вершы «Ты, мой брат, каго зваць Беларусам...», «Ідуць гады». Вызваленча-патрыятычныя матывы, агульначалавечыя каштоўнасці ў вершы «Ты, мой брат, каго зваць Беларусам...». Абвостранае пачуццё любові да радзімы. Праблемы сэнсу жыцця, прызначэння чалавека («Ідуць гады»). Філасафічнасць і публіцыстычнасць вершаў.

**Беларуская літаратура 1920-х – 1930-х гадоў: агляд.** Актывізацыя літаратурна-грамадскага руху і культурнага будаўніцтва ў 1920-я гады. Літаратурныя аб’яднанні «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», БелАПП і інш., іх роля ў гісторыі айчыннага пісьменства. Творчыя здабыткі і пошукі ў літаратуры 1920-х гадоў і іх спад у 1930-я гады пад уплывам ідэалагізацыі літаратурнага жыцця. Становішча, у якім апынуліся беларускія пісьменнікі ў 1930-я гады. Літаратура Заходняй Беларусі, яе сувязь з агульнанацыянальнай літаратурай (Уладзімір Жылка, Максім Танк і інш.).

**Максім Гарэцкі.** Апавяданні «Роднае карэнне», «Літоўскі хутарок». Звесткі пра жыццё і творчасць Максіма Гарэцкага.

«Роднае карэнне». Тэма вернасці роднай зямлі, служэння інтэлігенцыі народу. Вобраз Архіпа Лінкевіча – вясковага інтэлігента з абуджаным сумленнем, пачуццём абавязку перад людзьмі, які імкнецца пазнаць жыццё, знайсці «першапрычыну ўсякае істоты». Жыццёвая мудрасць дзеда Яхіма, яго запавет маладому пакаленню.

«Літоўскі хутарок». Аўтабіяграфічнасць апавядання. Трагізм лёсу герояў. Антываенная скіраванасць твора. Чалавек і абставіны ў творы.

**Змітрок Бядуля.** Апавяданне «Бондар». Асэнсаванне праблемы мастака і мастацтва. Асуджэнне эстэтычнай неразвітасці, чэрствасці і абыякавасці. Мастацкія адметнасці твора: сціслацсць, драматызм, псіхалагізм.

**Уладзімір Дубоўка.** Вершы «О Беларусь, мая шыпшына», «Залатая асенняя раніца…», «Родная мова, цудоўная мова!». Асноўныя матывы лірыкі. Паэтызацыя прыроды, кахання. Вобразнасць, багацце форм вершаў. Традыцыі фальклору ў лірыцы, уздзеянне паэзіі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча на творчасць Уладзіміра Дубоўкі.

**Кандрат Крапіва.** Байкі «Ганарысты Парсюк», «Дыпламаваны Баран». Камедыя «Хто смяецца апошнім».

Байкі. Крытыка чалавечых заган і недахопаў: невуцтва, ганарыстасці, фанабэрлівасці, агрэсіўнасці. Прыёмы стварэння камічных сітуацый. Народная мудрасць, гумар у байках. Блізкасць мовы твораў да гутарковай. Мараль у байках як выяўленне аўтарскай пазіцыі.

«Хто смяецца апошнім». Час напісання твора. Актуальнасць праблем, узнятых у камедыі. Канфлікт у п’есе. Маштабнасць сатырычных вобразаў Гарлахвацкага і Зёлкіна. Эвалюцыя характару Тулягі. Вобразы – носьбіты аўтарскай пазіцыі: Чарнавус, Левановіч, Вера. Раскрыццё характараў праз маўленне персанажаў. Сцэнічнае жыццё камедыі. Значэнне творчасці Кандрата Крапівы ў развіцці беларускай драматургіі.

**Міхась Зарэцкі.** Апавяданне «Дзіўная». Адлюстраванне псіхалогіі людзей з новым светапоглядам у апавяданні «Дзіўная». Драматызм лёсу Шумавай. Маральная праблематыка, асэнсаванне вечнага і часовага ў творы. М. Зарэцкі – майстар мастацкай дэталі, глыбокі псіхолаг.

**Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945).** Антываенны пафас і вызваленчыя матывы беларускай літаратуры. Тэма Радзімы, яе будучыні. Паказ суровай праўды вайны, услаўленне мужнасці і гераізму народа-змагара, асуджэнне здрады Радзіме. Адлюстраванне трагедыі чалавека на вайне. Адметнасць творчасці беларускіх пісьменнікаў у гады вайны: перавага лірыкі, публіцыстыкі, сатыры. Пісьменнікі – удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны: Аркадзь Куляшоў, Пімен Панчанка, Анатоль Астрэйка, Антон Бялевіч, Уладзімір Карпаў, Мікола Сурначоў і інш. Патрыятычная публіцыстыка.

Гераіка-патрыятычны пафас ваеннай лірыкі.

**Пятрусь Броўка.** Вершы «Спатканне», «Пахне чабор». Патрыятычны і грамадзянскі пафас твораў паэта. Выяўленне палымянай веры ў перамогу (верш «Спатканне»).

«Пахне чабор». Паэтычная споведзь пра першае каханне. Разнастайная гама перажыванняў лірычнага героя. Паэтызацыя чысціні і прыгажосці трапяткога пачуцця. Адметнасць паэтычнага сінтаксісу і яго роля ў выяўленні мастацкай ідэі верша.

**Аркадзь Куляшоў.** Вершы «Мая Бесядзь», «Спакойнага шчасця не зычу нікому...», «На паўмільярдным кіламетры», «Нябёсы – акіян, я знаў даўно...», балада «Над брацкай магілай». Звесткі пра жыццё і творчасць Аркадзя Куляшова.

Грамадзянская, маральна-этычная і філасофская праблематыка вершаў. Раскрыццё агульначалавечага праз глыбока асабістае. Услаўленне чалавека, яго духоўных каштоўнасцей, бязмежнасці пазнання сябе і свету. Суровая праўда ў

паказе народнага подзвігу. Трагічнае і лірычнае, фальклорныя матывы ў баладзе «Над брацкай магілай». Паэтычнае майстэрства Аркадзя Куляшова.

**Максім Танк.** Вершы «Мой хлеб надзённы», «Завушніцы», «Ты яшчэ толькі намёк на чалавека...», «Не знаю...», «Родная мова». Звесткі пра жыццё і творчасць Максіма Танка.

Тэмы і вобразы паэзіі Максіма Танка. Філасофскі роздум пра чалавека, яго жыццёвае прызначэнне. Увага да духоўнага свету чалавека, агульначалавечых каштоўнасцей. Адметнасць лірыкі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Сцвярджэнне нязломнай духоўнай сілы беларускага народа ў вершы «Родная мова». Шматграннасць паэтыкі.

**Кузьма Чорны.** Апавяданне «На пыльнай дарозе»; раман «Пошукі будучыні». Звесткі пра жыццё і творчасць Кузьмы Чорнага.

«На пыльнай дарозе». Мастацкае ўвасабленне аўтарскай формулы «Чалавек – гэта цэлы свет». Майстэрства пісьменніка ў раскрыцці ўнутранага свету герояў. Гуманістычны і жыццесцвярджальны пафас апавядання. Сімвалічны сэнс вобраза дарогі.

«Пошукі будучыні» – буйны эпічны твор часоў вайны. Сацыяльна-філасофскі змест рамана. Асаблівасці сюжэтна-кампазіцыйнай будовы твора. Драматычны лёс ахвяр Першай і Другой сусветных войнаў. Аўтарская канцэпцыя будучыні беларускага народа. Няздзейсненыя мары старэйшага пакалення (Нявады, Сымона Ракуцькі). Тэма «скрадзенага дзяцінства». Выкрыццё ідэалогіі фашызму. Асуджэнне авантурных планаў графа Паліводскага і Густава Шрэдэра. Антываенны пафас рамана.

**Беларуская літаратура пасляваенных дзесяцігоддзяў (1945–1965).** Патрыятычны і жыццесцвярджальны пафас творчасці, абумоўлены заканчэннем вайны, мірным будаўніцтвам. Вяртанне да класічных традыцый рэалістычнага мастацтва (проза Івана Мележа, Васіля Быкава, Янкі Брыля, Аляксея Кулакоўскага, паэзія Анатоля Вялюгіна, Аляксея Пысіна, Міколы Аўрамчыка, Кастуся Кірэенкі, Анатоля Вярцінскага, драматургія Кастуся Губарэвіча, Андрэя Макаёнка). Здабыткі ў жанры паэмы (Максім Танк «Люцыян Таполя», Пятрусь Броўка «Голас сэрца») (твор на выбар).

**Пімен Панчанка**. Вершы «Герой», «Родная мова», «Той дзень прапаў і страчаны навекі...», «Спарышы», «Крык сойкі».

Патрыятычны пафас ваеннай паэзіі Пімена Панчанкі. Гераічнае і трагічнае ў вершы «Герой». Роздум пра сэнс жыцця, гарманічныя адносіны паміж людзьмі і наваколлем. Спавядальны характар верша, адкрытасць, шчырасць лірычнага пачуцця. Публіцыстычная завостранасць твора, разнастайнасць рытміка-інтанацыйнага малюнка, выбар сродкаў мастацкага выяўлення.

**Іван Мележ.** Раман «Людзі на балоце». Звесткі пра жыццё і творчасць Івана Мележа.

«Людзі на балоце». Творчая гісторыя, тэматыка і праблематыка «Палескай хронікі». Нацыянальныя характары ў рамане. Майстэрства раскрыцця ўнутранага свету галоўных герояў – Васіля Дзятла і Ганны Чарнушкі. Настойлівае імкненне Васіля да самасцвярджэння і незалежнасці, яго

цярплівасць, працавітасць, разгубленасць у складаных жыццёвых абставінах. Драматычны лёс Ганны. Нетрадыцыйны падыход аўтара да раскрыцця псіхалогіі заможных сялян. Драматызм становішча Глушака ў час калектывізацыі. Чалавек і прырода ў творы. Псіхалагічнае майстэрства Мележа-празаіка.

**Шляхі развіцця беларускай літаратуры другой паловы XX ст.**

**Развіццё беларускай літаратуры ў 1960-х – пачатку 1990-х гадоў**

Літаратура ва ўмовах новай грамадска-палітычнай сітуацыі. Значнасць гісторыка-сацыяльных пераўтварэнняў. Пашырэнне сферы мастацкага асэнсавання рэчаіснасці. Жанравыя і тэматычныя пошукі літаратуры, паглыбленне яе чалавеказнаўчага і гуманістычнага зместу. Узмацненне аналітызму ў даследаванні мінулага і сучаснасці. Антываенны пафас творчасці пісьменнікаў філалагічнага пакалення.

**Іван Шамякін.** Аповесць «Непаўторная вясна» (1-я кніга пенталогіі «Трывожнае шчасце»); раман «Сэрца на далоні». Звесткі пра жыццё і творчасць Івана Шамякіна.

Адлюстраванне даваеннага жыцця моладзі ў аповесці «Непаўторная вясна». Духоўны свет Пятра і Сашы, іх узаемаадносіны. Паэзія кахання і прыгожых чалавечых пачуццяў. Маральна-этычная праблематыка аповесці. Эмацыянальна-псіхалагічная змястоўнасць твора. Лірычны характар аўтарскага пісьма.

«Сэрца на далоні». Праблематыка рамана. Маральна-этычная сутнасць аўтарскай пазіцыі. Рэтраспектыўны зварот да падзей вайны. Вастрыня канфлікту. Вобраз кар’ерыста Гукана. Прынцыповасць і рашучасць Кірылы Шыковіча ў выкрыцці Гукана. Партызанскае мінулае Яраша. Вобраз Зосі Савіч, яе лёс. Маладое пакаленне ў рамане.

**Андрэй Макаёнак.** «Зацюканы апостал». Жанравая адметнасць п’есы. Спалучэнне ў творы камічнага і трагічнага. Умоўнасць часу і месца дзеяння. Характарыстыка персанажаў, іх сімвалічнасць і падкрэсленая абагульненасць. Маральна-этычны змест камедыі, сцвярджэнне аўтарам агульначалавечых духоўных каштоўнасцей.

**Янка Брыль.** Апавяданне «Memento mori»; лірычныя мініяцюры «Загадка», «Трохі пра вечнае». Звесткі пра жыццё і творчасць Янкі Брыля.

Паказ вайны ў апавяданні «Memento mori». Маральны подзвіг старога селяніна ў творы. Уменне аўтара бачыць гераічнае за рамкамі бытавых сцэн. Асуджэнне фашызму ў апавяданні. Мастацкае ўвасабленне народнага гераізму. Урачыстая танальнасць аўтарскага пісьма.

Жанр міні-прозы ў творчасці Я. Брыля. Паэтычнасць «імгненняў жыцця». Сродкі стварэння мастацкага вобраза ў «малой прозе». Ідэя разнастайнасці жыцця і яго адлюстраванне ў творчасці.

**Васіль Быкаў.** Аповесці «Жураўліны крык», «Знак бяды». Звесткі пра жыццё і творчасць Васіля Быкава.

«Жураўліны крык». Мастацкая праўда ў паказе вайны. Паводзіны чалавека ў экстрэмальнай сітуацыі. Раскрыццё ў трагічных абставінах характараў герояў. Вытокі подзвігу старшыны Карпенкі, байцоў Глечыка,

Фішара, Свіста. Праблема маральнага выбару. Глыбіня псіхалагічнага аналізу ў раскрыцці вобразаў Аўсеева і Пшанічнага.

«Знак бяды». Маральна-філасофская праблематыка аповесці. Вастрыня трагедыйнага канфлікту. Маштабнасць характараў галоўных герояў – Петрака і Сцепаніды. Зварот аўтара да эпізодаў даваеннага жыцця. Паказ прыслужнікаў акупацыйнага рэжыму. Глыбокі псіхалагізм аповесці. Мастацкая сімволіка твора. Значэнне творчасці Васіля Быкава для развіцця беларускай літаратуры.

**Уладзімір Караткевіч.** Аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха»; раман «Каласы пад сярпом тваім». Звесткі пра жыццё і творчасць Уладзіміра Караткевіча.

«Дзікае паляванне караля Стаха». Гістарычная аснова твора. Каларыт, атмасфера мінулай эпохі (80-я гг. XIX ст.). Роздум аб прызначэнні чалавека на зямлі, аб лёсе беларускага народа, узаемасувязі розных гістарычных эпох. Праблемы дабра і зла, кахання, мужнасці і гераізму. Вобразы Андрэя Беларэцкага, Андрэя Свеціловіча і Надзеі Яноўскай. Асаблівасці кампазіцыі твора.

«Каласы пад сярпом тваім». Гістарычная аснова рамана. Прадстаўнікі дваранства ў рамане (Даніла Вежа-Загорскі, Хаданскія, Кроер). Вобразы сялян у рамане. Праўдзівасць адлюстравання чалавечых характараў. Духоўны воблік галоўнага героя рамана Алеся Загорскага. Хараство кахання Алеся Загорскага і Майкі Раўбіч. Сімволіка ў творы.

**Міхась Стральцоў.** Апавяданне «Сена на асфальце». Тэматыка, ідэйны пафас. Эцюды-ўспаміны пра маладосць, каханне, жыццёвыя праблемы і клопаты. Вобраз аўтара-апавядальніка і іншых герояў твора. Прырода ў творы. Адметнасць кампазіцыі. Лірызм стылю.

**Яўгенія Янішчыц.** Вершы «Ты пакліч мяне. Пазаві...», «Чаму ніколі не баюся я...», «Не воблака, а проста аблачынка...», «Любоў мая...». Тэматычная палітра паэзіі Яўгеніі Янішчыц: малая радзіма, казачная палеская прырода, вясковы і гарадскі побыт, лірыка кахання.

**Ніл Гілевіч.** Вершы «Край мой беларускі, край!..», «Ах, якая над Гайнай купальская ноч!..», «Страціў слова, страціў спадчыннае слова...»; раман у вершах «Родныя дзеці».

Лірыка. Любоў да Бацькаўшчыны, клопат пра яе лёс, шанаванне роднай мовы, захаванне культурнай спадчыны, паэтызацыя прыроды – асноўныя тэмы паэзіі Ніла Гілевіча. Глыбокі лірызм, песеннасць вершаў, фальклорныя матывы ў творах паэта.

«Родныя дзеці». Праблематыка твора. Вобраз галоўнага героя Сцяпана Вячоркі. Героі другога плана і іх роля ў творы. Сюжэтна-кампазіцыйная структура. Значэнне лірычных адступленняў.

**Іван Чыгрынаў.** Апавяданне «Дзівак з Ганчарнай вуліцы». Памяць мінулай вайны. Лёс старога лесніка Дземідзёнка. Вобраз героя-апавядальніка.

**Іван Навуменка.** Апавяданне «Сямнаццатай вясной». Паказ лёсу моладзі ў гады вайны з фашызмам. Раскрыццё ў творы характараў Цімоха, Стасі і іншых герояў. Эмацыянальнасць зачыну апавядання, лірызм аповеду. Сімвалічнасць вобраза бэзу.

**Рыгор Барадулін.** Вершы «Трэба дома бываць часцей», «Неруш», «Яна адна, зямля вякоў…», «Бацьку», «Заспаная раніца мжыстая…», «Чалавек не ўзнікае так…» Звесткі пра жыццё і творчасць Рыгора Барадуліна.

Паэтычныя вобразы Радзімы, зямлі бацькоў і беларускага народа ў паэзіі Рыгора Барадуліна. Услаўленне роднага слова як духоўнай святыні. Роздум пра сэнс чалавечага жыцця і повязь пакаленняў. Асабістае і агульначалавечае ў вершах паэта. Асаблівасці паэтычнага майстэрства.

**Алесь Разанаў.** Вершы «Радзіма…», «Кожны народ мае…», «У крузе», «Спадчына», «Горад». Філасофска-інтэлектуальны кірунак творчасці: суадносіны агульначалавечага (быційнага) і нацыянальна-гістарычнага (асабістага). Тэма Бацькаўшчыны ў лірыцы паэта. Адметнасць творчай індывідуальнасці. Жанрава-стылёвыя асаблівасці лірыкі. Асацыятыўная вобразнасць. Роля Алеся Разанава ў развіцці сучаснай беларускай эксперыментальнай паэзіі.

**Георгій Марчук.** Навелы «Канон Гарыні», «Канон Маці». Жанрава-стылёвая спецыфіка твораў. Захапляльнае падарожжа па радзіме пісьменніка, асэнсаванне жыцця палешукоў, іх традыцый. Мудрасць разумення аўтарам чалавечага шчасця і іншых духоўных каштоўнасцей.

**Аляксей Дудараў.** П’еса «Князь Вітаўт». Наватарскі падыход драматурга да ўвасаблення далёкага мінулага. Жанравая адметнасць твора, асаблівасці яго кампазіцыі. Вітаўт і Ягайла як вобразы-тыпы. Завастрэнне маральна-этычнага канфлікту. Праблема асабістага шчасця ў п’есе.

**Міхась Башлакоў.** Вершы «Заркапад», цыкл «Радзіма...».

Свет Радзімы-Беларусі ў творчасці паэта, выяўленне пачуцця любові да зямлі бацькоў. Знітаванасць з родным краем як духоўная аснова ўнутранага свету лірычнага героя. Філасофскі роздум пра хуткаплыннасць часу і сэнс чалавечага жыцця.

## Сучасная беларуская літаратура

**Літаратурны працэс у Беларусі на сучасным этапе.** Змяненне ролі літаратуры ў жыцці грамадства. Новая літаратурная сітуацыя. Утварэнне і дзейнасць грамадскага аб’яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі», яго супрацоўніцтва з пісьменнікамі іншых краін свету. Творчасць пісьменнікаў-землякоў. Літаратурна-мастацкая перыёдыка (часопісы «Полымя», «Маладосць» і інш.).

**Паэзія.** Паглыбленне агульначалавечага, маральна-філасофскага, гуманістычнага зместу лірыкі, яе грамадзянска-публіцыстычны і індывідуальна-асобасны пачатак у творчасці Янкі Сіпакова, Юрася Свіркі, Генадзя Пашкова, Міхася Пазнякова, Раісы Баравіковай, Мар’яна Дуксы, Уладзіміра Карызны і інш. Разнастайнасць творчых індывідуальнасцей у сучаснай паэзіі: Алесь Бадак, Навум Гальпяровіч, Мікола Мятліцкі і інш. Наватарства ў галіне вершаванай формы і іншыя мастацкія пошукі сучаснай паэзіі (Алесь Разанаў, Людміла Рублеўская, Віктар Шніп і інш.). Агляд творчасці 2-3 паэтаў на выбар абітурыента.

**Проза.** Тэматыка і сацыяльна-філасофская праблематыка сучаснай прозы. Асэнсаванне пісьменнікамі стасункаў асобы і грамадства, повязі часоў і

пакаленняў: «Пісьмо ў Рай» Алеся Савіцкага, навела «Адна капейка» Уладзіміра Сцяпана, «Вяртанне да віны» Івана Чыгрынава, «Вір» Івана Навуменкі, «Кулак» Янкі Сіпакова і інш.

**Драматургія.** Тэндэнцыі развіцця беларускай драматургіі на сучасным этапе. Узмацненне цікавасці да гістарычнага мінулага ў творчасці Алеся Петрашкевіча, Уладзіміра Бутрамеева, Раісы Баравіковай і інш. Новыя мастацка-эстэтычныя тэндэнцыі ў сучаснай беларускай драматургіі (Ігар Сідарук, Пятро Васючэнка і інш.).

## СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

### Асноўная літаратура:

1. Цітова, Л.К. Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агульн. сярэдн. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч./ Л.К. Цітова. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016. – Ч. 1 (размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ru/ucheniky/podgotovka-k-ekzamenam.html).

2. Цітова, Л.К. Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агульн. сярэдн. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Л.К. Цітова. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016. – Ч. 2 (размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ru/ucheniky/podgotovka-k-ekzamenam.html).

3. Бельскі, А.І. Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агульн. сярэдн. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / А.І. Бельскі, Л.К. Цітова. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016 (размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ru/ucheniky/podgotovka-k-ekzamenam.html).

4. Лазарук, М.А. Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агульн. сярэдн. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / М.А. Лазарук, Т.У. Логінава, Г.А. Сухава. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017 (размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ru/ucheniky/podgotovka-k-ekzamenam.html).

5. Лазарук, М.А. Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агульн. сярэдн. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / М.А. Лазарук [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2018 (размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ru/ucheniky/podgotovka-k-ekzamenam.html).

6. Праскаловіч, В.У. Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В.У. Праскаловіч [і інш.] ; пад рэд. В.У. Праскаловіч, В.П. Рагойшы. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019 (размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ru/ucheniky/podgotovka-k-ekzamenam.html).

7. Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / А.П. Бязлепкіна-Чарнякевіч [і інш.] ; пад рэд. А.П. Бязлепкінай-Чарнякевіч, І.Д. Воюш. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020 (размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ru/ucheniky/podgotovka-k-ekzamenam.html).

8. Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / З.П. Мельнікава [і інш.] ; пад рэд. З.П. Мельнікавай, Г.М. Ішчанкі. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021 (размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ru/ucheniky/podgotovka-k-ekzamenam.html).

**Дадатковая літаратура:**

1. Бельскі А. І. Сучасная беларуская літаратура: Станаўленне і развіццё творчых індывідуальнасцяў (80 – 90-я гг.): дапам. для настаўнікаў. – Мн., 1997.
2. Бельскі А. І. Сучасная літаратура Беларусі: дапам. для настаўнікаў. – Мн., 2000.
3. Бельскі А. І. Беларуская літаратура XX стагоддзя: Гісторыя і сучаснасць. – Мн., 2005.
4. Васючэнка П. В. Сучасная беларуская драматургія. – Мн., 1984.
5. Гарадніцкі Я. А. Мастацкі свет беларускай літаратуры XX стагоддзя. – Мн., 2005.
6. Гісторыя беларуская літаратуры: XIX – XX ст. / пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – 2-е выд., дапрац. – Мн., 1998.
7. Лаўшук С. С. Гарызонты беларускай драматургіі. – Мн., 2010.
8. Лойка А. А. Гісторыя беларускай літаратуры: Дакастрычніцкі перыяд: у 2 ч. – 2-е выд. дапрац. – Мн., 1989. – Ч. 2.
9. Лойка А. А. Старабеларуская літаратура. – Мн., 2001.
10. Лявонава Е. А. Агульнае і адметнае: Творы беларускіх пісьменнікаў XX ст. у кантэксце сусветнай літаратуры. – Мн., 2004.
11. Мішчанчук М. І. Беларуская савецкая паэзія 20-30-х гадоў. – Мн., 1988.
12. Мішчанчук М. І., Шпакоўскі І. С. Беларуская літаратура XX ст.: вучэб. дапам. – Мн., 2001.
13. Мушынская Т. Ф. Беларуская літаратура 20—40-х гадоў XX стагоддзя. – Мн., 2000.

# ДАДАТАК

# АЦЭНКА ВЫНІКАЎ ПРОФІЛЬНЫХ ЎСТУПНЫХ ІСПЫТАЎ ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”

## Крытэрыі ацэнкі ведаў абітурыентаў

1. Веданне тэкстаў праграмных твораў, разуменне ідэйнага зместу і матацкіх асаблівасцей.
2. Веданне асноўных звестак пра жыццё і творчы шлях аўтараў, уключаных у праграму.
3. Веданне звестак аб асноўных перыядах развіцця беларускай літаратуры і іх асаблівасцях.
4. Уменне аналізаваць мастацкія творы ў адзінстве зместу і формы.
5. Паўната і правільнасць раскрыцця экзаменацыйных пытанняў.
6. Валоданне літаратуразнаўчай тэрміналогіяй і яе выкарыстанне пры адказе.
7. Лагічнасць, аргументаванасць, кампазіцыйная стройнасць адказа.
8. Моўнае афармленне адказа.
9. Уменне выказваць сваё меркаванне па абмяркоўваемай праблеме.
10. Уменне даваць аргументаваныя адказы на дадатковыя пытанні экзаменатараў.

## Шкала ацэнкі ведаў абітурыентаў

**10 (дзесяць) балаў.** Абодва экзаменацыйныя пытанні маюць вычарпальнае, дакладнае асвятленне. Абітурыент дэманструе добрае веданне тэкстаў і вольнае валоданне літаратуразнаўчым аналізам, выкладае матэрыял паслядоўна, праводзіць аналогіі і супастаўленні, робіць неабходныя абагульненні і высновы; у ходзе адкаху чытае напамяць праграмныя творы або іх фрагменты. Змест адказу сведчыць пра начытанасць абітурыента, пра глыбокую, індывідуальна-асабістую ўспрыемнасць літаратуры як мастацтва слова. Арыгінальнасць і творчы падыход да раскрыцця экзаменацыйных пытанняў. Правільная, багатая, выразная мова. Адсутнасць фактычных і моўных памылак.

**9 (дзевяць) балаў.** Абодва экзаменацыйныя пытанні маюць поўнае асвятленне. Адка на адно пытанне дазваляе заўвагі непрынцыповага характару. Змест адказу сведчыць аб упэўненых ведах абітурыента і яго ўменні аналізаваць тэкст. Арыгінальнасць і абгрунтаванасць меркаванняў. Уменне бачыць ролю і значэнне твора ў канкрэтных гістарычных умовах. Развітая, правільная мова. Адсутнасць моўных памылак. Творчы падыход пры выкананні

заданняў. Самастойнасць, абгрунтаванасць меркаванняў. Дапушчальныя 1-2 моўныя памылкі, выпраўленыя самім абітурыентам.

**8 (восем) балаў.** Адно экзаменацыйнае пытанне мае вычарпальнае асвятленне, другое – частковае, з заўвагамі непрынцыповага характару. Вольнае валоданне тэкстамі твораў, абазначаных у экзаменацыйным білеце. Нязначныя недахопы ў паслядоўнасці выкладання і моўным афармленні адказу. Самастойнасць ацэнкі гісторыка-літаратурнага матэрыяла. Граматная мова. Дапушчальныя 1-2 моўныя памылкі.

**7 (сем) балаў.** Два пытанні білета маюць частковае асвятленне з заўвагамі непрынцыповага характару. Адказ выяўляе добрае веданне і разуменне літаратурнага матэрыялу, уменне аналізаваць тэкст твора. У адказе прыводзяцца неабходныя прыклады. Матэрыял раскрыты ў асноўным правільна, але схематычна ці недастаткова поўна, з адхіленнямі ад паслядоўнасці выкладу. Аналіз тэкста часткова падмяняецца пераказам, недастсткова поўна разгорнута аргументацыя, магчымы асобныя недахопы ў фармулёўцы высноў. Ілюстратыўны матэрыял прадстаўлены не вельмі падрабязна; дапушчаны асобныя пагрэшнасці ў чытанні напамяць і моўным афармленні выказванняў. Дапушчальная наяўнасць 2-3 нягрубых моўных і лексічных памылак, якія абітурыент сам выпраўляе.

**6 (шэсць) балаў.** Абодва пытанні маюць частковае асвятленне. Заўвагі па аднаму пытанню маюць істотны характар. Змест адказаў сведчыць аб здавальняючых ведах абітурыента і ўменні аналізаваць тэкст. Агульнае веданне тэкстаў твораў. Дастаткова поўнае разуменне і асэнсаванне тэкста на фоне эмацыйнага перажывання сітуацыі. Уменне карыстацца ў працэсе аналіза метадам параўнання. Наяўнасць нягрубых моўных і лексічных недахопаў, якія абітурыент выпраўляе самастойна. Дапушчальны 3-4 моўныя памылкі.

**5 (пяць) балаў.** Абодва пытанні маюць частковае асвятленне. Заўвагі па абодвум пытанням маюць істотны характар. Несамастойнасць меркаванняў і схематычнае веданне тэкста твора. Абітурыент разважае спрошчана, павярхоўна, недакладна, слаба аргументуе адказ, падмяняе аналіз пераказам, і/або робіць 2 фактычныя памылкі. Недастатковыя навыкі вуснага маўлення; ёсць парушэнні літаратурнай нормы. Моўныя і лексічныя памылкі, многія з якіх абітурыент самастойна не заўважае. Дапушчальны 4-5 нягрубых моўных памылак.

**4 (чатыры) балы.** Абодва пытанні білета маюць частковае асвятленне. Заўвагі па абодвух пытаннях маюць істотны характар. Адказы выяўляюць дрэннае веданне тэкстаў твораў. Фрагментарная ўспрыемнасць літаратурнага твора, актуалізацыя неістотных дэталяў пры няўвазе да змястоўных параметраў. Аналіз падмяняецца пераказам. Абітурыент з цяжкасцю фармулюе думкі. У адказе адсутнічаюць неабходныя прыклады; парушана логіка ў выкладанні

матэрыялу, няма неабходных абагульненняў і высноў. Па просьбе абітурыента дазваляецца замена твора, прапанаванага для аналіза ў экзаменацыйным білеце, на іншы праграмны твор. Мова развіта недастаткова, прысутнічаюць моўныя памылкі (5-6).

**3 (тры) балы.** Адно пытанне білета мае частковае асвятленне, другое пытанне асвятляецца няправільна. Змест адказаў сведчыць пра слабыя веды абітурыента і яго няўменне аналізаваць тэкст. Твор прачытаны, але ўзнаўляецца неўсвядомлена, фрагментарна. Недастатковая аргументацыя свайго пункту гледжання. Абітурыент не адказвае на пытанні экзаменатараў. Па просьбе абітурыента дазваляецца замена білета. Мова развіта слаба, шмат лексічных і стылістычных памылак (6-7).

**2 (два) балы.** Абодва экзаменацыйныя пытанні асвятляюцца няправільна. Адказ выяўляе няведанне тэкста і няўменне яго аналізаваць. Тэкст прачытаны не поўнасцю, успрыняты на элементарным узроўні. Вучань мае цяжкасці з пераказам; не ведае тэксту твора, жыццёвага і творчага шляху аўтара. Мова не развітая. Шмат моўных і граматычных памылак (7-8).

**1 (адзін) бал.** Па адным пытанні адказ адсутнічае. Другое пытанне асветлена няправільна. Шмат моўных і граматычных памылак (болей 8).

**0 (нуль) балаў.** Адказ адсутнічае па абодвух пытаннях экзаменацыйнага білета.